ДЭМАГРАФІЯ

# Імёны для ліпеньскіх малышоў



А гэтую малечу бацькі назвалі Юліяй.

**Нараджэнне дзіцяці ў сям'і – гэта важная і радасная падзея. Але разам з тым з'яўляецца і шмат клопатаў. У тым ліку – як назваць немаўля.**

Маленькім любанчанкам, якія з'явіліся на свет у ліпені, бацькі далі такія распаўсюджаныя імёны, як Аляксандра, Алёна, Ганна, Варвара, Лізавета і іншыя. А ў некалькіх выпадках і больш рэдкія – Ніколь, Эмілія. Для хлопчыкаў абралі: Мацвей, Міхаіл.

Ёсць меркаванне, што імя вызначае характар. Але незалежна ад гэтага хай усе дзеткі растуць добрымі, кемлівымі, паслухмянымі.

## Узаемаразумення і згоды

**Органамі запісу актаў грамадзянскага стану нашага раёна ў мінулым месяцы зарэгістравана 20 шлюбаў – дваццаць новых ячэек грамадства.**

Сярод маладажонаў, адзначыўшых такую значную падзею, 26 стварылі сям'ю ўпершыню. У дзевяці выпадках шлюб стаў першым і для нявесты, і для жаніха, у трох – паўторны для абоіх. Самым юным з іх на дзень урачыстасці споўнілася адпаведна 19 і 20 гадоў, а старэйшым – 57 і 60.

Шчырыя пажаданні любанчанам, для якіх у ліпені прагучаў марш Мендэльсона: шчасця, пяшчоты, дабрабыту, удачы, згоды. Ісці разам па жыццёвай дарозе, адчуваючы падтрымку, узаемаразуменне, клопат і каханне ў адносінах.

## З юбілеем!

**Радасці і няўдачы, выпрабаванні і поспехі – усё гэта было ў біяграфіі доўгажыхароў нашага раёна, якія адзначаюць у жніўні свае 90-годдзе.**

А гэта Сцепаніда Сямёнаўна Касцюкавец з аграгарадка Рачэнь, Антаніна Мікалаеўна Сенажацкая з вёскі Шыпілавічы і Вольга Аляксандраўна Дуброўская з горада Любані. У кожнай з жанчын свой лёс, але ўсе яны аднолькава мудрыя, шчырыя і добразычлівыя.

Самыя лепшыя зычанні нашым паважаным юбіляркам. Хай не згасае агеньчык у іх вачах, сэрца поўніцца радасцю, не пакідае бадзёрасць духу.

**Марына ІСУНОВА,**
**начальнік аддзела загс**
**Любанскага райвыканкама.**

ЛІЧБА ТЫДНЯ

# На адзенне і канцылярскія тавары

**519 шматдзетных сямей, што зарэгістраваны на тэрыторыі Любанскага раёна, атрымалі адзінаразавую матэрыяльную дапамогу на падрыхтоўку 1075 школьнікаў да 2022/2023 навучальнага года.**

Агульная сума выплат склала 105 941,25 руб., альбо 98,55 руб. на адно дзіця. Пра гэта паведаміла загадчык аддзялення пярвічнага прыёму, аналізу, інфармавання і прагназавання тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Любанскага раёна Наталля Колтун. Грошы пераведзены на банкаўскія карткі атрымальнікаў. Матэрыяльная падтрымка аказана за кошт сродкаў раённага бюджэту.

Адзінаразавая дапамога выплачваецца згодна з рашэннем Любанскага раённага Савета дэпутатаў. Яна прадугледжана Дзяржаўнай праграмай «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2021–2025 гады.

Наталля Колтун падкрэсліла, што канчатковы тэрмін аказання адзінаразавай дапамогі – 31 жніўня. Магчыма, за гэтыя няпоўныя два тыдні яшчэ якая сям'я набудзе статус шматдзетнай альбо зарэгіструецца на тэрыторыі Любанскага раёна. Яна таксама атрымае выплату.

Адзначым, у параўнанні з мінулым годам колькасць тых, каму аказана адзінаразавая дапамога, павялічылася: у 2021 годзе дадзеным відам матэрыяльнай падтрымкі былі ахоплены 497 сямей, у якіх выхоўвалася 1026 школьнікаў.

**Дар'я РАБЦАВА.**



**У шматдзетнай сям'і КАСЦЮКАЎЦОЎ з Любані дзве школьніцы: Ангеліна сёлета ідзе ў трэці клас, Мілена – у першы.**

БЛАГОТВОРИТЕЛЬНОСТЬ

# В школу с Добрым Сердцем

**На Любанщине стартовала акция «В школу с Добрым Сердцем».**

С 16 по 28 августа волонтерами районного комитета общественного объединения «Белорусский республиканский союз молодежи» будут собираться канцелярские товары и школьные принадлежности, что впоследствии передадут детям-сиротам, многодетным и семьям, которые оказались в трудной ситуации.

Пункт сбора будет находиться возле магазина «Позитиf» по следующему адресу: г. Любань, пер. Красноармейский, д. 14.

Все принадлежности можно передать бойцам из волонтерского отряда «Крылья ангела» (ГУО «СШ N 3 г. Любани им. Г.Л. Сечко») или же оставить в коробке возле входа в магазин.

«ОДНО ОКНО»

# От рождения до последней в жизни записи

**Так сложилось, что сотрудникам органов загса ежедневно приходится сталкиваться как с радостными, так и с печальными событиями в судьбе людей.**

В соответствии с главой 5 Перечня административных процедур, осуществляемых государственными органами и иными организациями по заявлениям граждан, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 26 апреля 2010 г. №200, органы, регистрирующие акты гражданского состояния, осуществляют 15 административных процедур: регистрацию рождения, заключения брака, установления отцовства, материнства, регистрацию смерти, расторжения брака по решениям судов, вступившим в законную силу до 1 сентября 1999 г., а также по взаимному согласию супругов, не имеющих общих несовершеннолетних детей и спора об имуществе, регистрацию усыновления, перемены фамилии, собственного имени, отчества, выдачу повторного свидетельства о регистрации акта гражданского состояния, внесение изменений, дополнений и исправлений в записи актов гражданского состояния, восстановление их, аннулирование, выдачу справок о рождении, о смерти, содержащих сведения из записей актов гражданского состояния, извещений об отсутствии записи акта гражданского состояния.

При этом осуществление административных процедур производится по письменным и (или) устным заявлениям заинтересованных лиц, поданным исключительно в ходе приема. То есть необходимо личное обращение гражданина в орган загса. Что касается получения справок, то имеется возможность заранее заказать ее по телефону. Но для получения все же придется посетить орган загса с предоставлением документа, удостоверяющего личность, а при необходимости – и иных, подтверждающих право на получение соответствующего документа.

К слову, по большинству вопросов, входящих в компетенцию отдела загса, гражданам необходимо обращаться лично. Однако существуют отдельные административные процедуры, по выполнению которых допускается представительство, оформляемое нотариально заверенной доверенностью.

Что касается регистрации актов гражданского состояния, для этого нужно собрать документы в соответствии с перечнем, все остальные отдел загса запрашивает самостоятельно. Стоит отметить, в январе-июне 2022-го в отдел загс Любанского райисполкома поступило 1 299 заявлений от заинтересованных лиц об осуществлении административных процедур, по которым были приняты соответствующие решения и выдано 1 500 документов (286 свидетельств при регистрации актов гражданского состояния, 130 повторных свидетельств, 4 извещения об отсутствии записи акта гражданского состояния и 1 080 справок).

В отделе загс Любанского райисполкома установлен очень удобный режим работы: граждане могут обращаться шесть дней в неделю (понедельник – 08.00–13.00, 14.00–17.00; вторник, четверг, пятница – 08.00–17.30, без перерыва на обед; среда – 08.00–18.00, без перерыва на обед; суббота – 08.30–11.30).

С подробной информацией об осуществляемых отделом загса административных процедурах можно ознакомиться на официальном сайте Любанского районного исполнительного комитета (закладка – отдел записи актов гражданского состояния). Кроме того, предварительное консультирование граждан по вопросам, входящим в компетенцию органов загса, может быть осуществлено по телефонам: 64-5-05, 67-6-44.